УДК 63(091)(476)

*Л.І. Ермаковіч, П.С. Рамановіч*

# ВЁСКА КОБРЫНШЧЫНЫ Ў ПЕРАДВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1939–1941 гг.)

У артыкуле разглядаюцца і аналізуюцца мерапрыемствы савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі Кобрынскага раёна пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР з восені 1939 г. па чэрвень 1941 г. Пры гэтым галоўная ўвага надаецца разгляду асноўных накірункаў аграрных пераўтварэнняў: вынішчэнне аграрнай спадчыны польскай дзяржавы, ліквідацыя заможнай часткі сялянства, абмежаванне эканамічнай свабоды селяніна і пазбаўленне яго гаспадарчай самастойнасці з пачаткам калгаснага будаўніцтва. У кантэксце аграрных пераўтварэнняў таксама разглядаецца змест масава-палітычнай работы сярод сялянства з мэтай змянення яго псіхалогіі і фарміравання лаяльных адносін да савецкай улады.

## Уводзіны

У айчыный гістарычнай навуцы праблемам і пытанням развіцця аграрных адносін у розныя часы надаецца належная ўвага. Гістарычны вопыт сельскагаспадарчага развіцця мае не толькі пазнавальнае значэнне. Ён, безумоўна, можа быць запатрабаваны пры ажыццяўленні аграрнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе. Тым больш, што гэты вопыт, як станоўчы, так і адмоўны, датычыцца ўзаемаадносін дзяржавы з галоўнай фігурай у сельскай гаспадарцы – селянінам, чыё стаўленне да працы прадвызначае вынікі гаспадарання на зямлі. Апроч таго, выбар тэмы артыкула тлумачыцца той акалічнасцю, што яна мае краязнаўчы аспект, які яшчэ недастаткова распрацаваны ў навуковай літаратуры. Да таго ж артыкул падрыхтаваны на аснове выкарыстання архіўных крыніц, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы зварот.

## Сельскагаспадарчае развіццё Кобрынскага раёна ў 1939–1941 гг.

Кобрынскі раён быў утвораны 15 студзеня 1940 г. у складзе Брэсцкай вобласці. 12 кастрычніка 1940 г. ён быў падзелены на 13 сельсаветаў: Батчынскі, Жухавіцкі, Закросніцкі, Засімаўскі, Казішчынскі, Кісялёвіцкі, Красналескаўскі, Лепясоўскі, Пескаўскі, Стрыгаўскі, Тэвельскі, Хідрынскі, Яроміцкі. Пасля заняцця Кобрынчшыны Чырвонай Арміяй у верасні 1939 г. тут новымі органамі савецкай улады распачаліся сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Гэтыя пераўтварэнні адбываліся ва ўмовах панавання польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання, існавання індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.

Напрыканцы 1939 г. ў Кобрынскім раёне мелася 6 856 сялянскіх гаспадарак, з якіх 1 566 гаспадарак мелі раллі да 2-х га, 2 702 гаспадаркі – па 2–4 га раллі, 1 586 гаспадарак – па 4–6 га, 603 гаспадаркі – па 6–8 га, 218 гаспадарак – па 8–10 га, 87 гаспадарак – па 10–12 га, 44 гаспадаркі – па 12–15 га, 48 гаспадарак – звыш 15 га [1]. У сярэднім на адну сялянскую гаспадарку прыпадала 7,97 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 3,81 га раллі і 2,17 га сенажаці. Такім чынам, вёска Кобрынчшыны, як увогуле ўсёй Заходняй Беларусі, была малазямельнай. Таму многія сяляне, перш за ўсё сельская бедната, звязвалі з савецкай уладай надзеі на вырашэнне зямельнага пытання на сваю карысць. Спачатку гэтыя надзеі спраўджваліся. Першым крокам на шляху аграрных пераўтварэнняў з боку новай улады стала ліквідацыя польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання. Прававаой падставай для гэтага стала Дэкларацыя Народнага сходу Заходняй Беларусі ад 29 кастрычніка 1939 г. аб канфіскацыі зямель памешчыкаў, кляштароў, буйных дзяржаўных чыноўнікаў з усім інвентаром, сядзібнымі пабудовамі і жывёлай. Паводле гэтай Дэкларацыі ўся зямля абвяшчалася дзяржаўнай уласнасцю. Адсюль вын-

кала, што сяляне пераставалі быць уладальнікамі прыватнай зямельнай уласнасці. Аднак яны яшчэ заставаліся яе індывідуальнымі карыстальнікамі і маглі распараджацца вынікамі сваёй працы на зямлі.

Рашэнне аб ліквідацыі польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання звычайна прымалася сялянскімі камітэтамі і пастановамі агульных сходаў сялян па месцы іх жыхарства. Пасля гэтага канфіскаваная зямля перадавалася ў карыстанне батракам і беднякам. Гэта быў палітычна і эканамічна пазітыўны крок. Ён дазволіў прыцягнуць на бок бальшавіцка-савецкай улады найбольш абяздоленую частку сялянства, а таксама павысіць узровень яе матэрыяльнага дабрабыту і падатказдольнасці. У цэлым надзяленне сялян зямлёй садзейнічала аптымальнаму спалучэнню інтэрэсаў сялянства і дзяржавы. Аднак неўзабаве дзяржаўныя мерапрыемствы ў вёсцы сталі набываць усё больш антысялянскі характар. Пачынаючы з вясны 1940 г. сяляне сталі абкладвацца сельскагаспадарчым падаткам у грашовай форме і абавязковымі натуральнымі дзяржаўнымі пастаўкамі сельгаспрадукцыі (мяса, малако, лён, збожжа, бульба, воўна). Пры гэтым велічыня сельгаспадатку і натуральных дзяржпаставак вызначалася не толькі з раллі, але з усёй зямлі, якой карыстаўся селянін (паша, лугі, хмызнякі, пусткі). Улічвалася таксама колькасць працаздольных членаў сям'і і жывёлы ў сялянскай гаспадарцы. Пры гэтым сялянскія гаспадаркі абкладваліся па рыначнай шкале, але тыя ж гаспадаркі пастаўлялі дзяржаве сельгаспрадукцыю па дзяржаўных фіксаваных цэнах, якія былі многа нізшымі, чым рыначныя, і часта не пакрывалі сабекошту пастаўляемай прадукцыі.

Зразумела, што вялікі падатковы ціск пазбаўляў сялян магчымасці павялічваць эканамічную моц сваіх гаспадарак і паляпшаць свой дабрабыт. Таму яны масава звярталіся да ўладаў з просьбай зменшыць узровень падаткаў і вызначаць іх выключна ў залежнасці ад колькасці ворыўнай зямлі ў іх карыстанні. Так, селянін вёскі Каленіца Тэвельскага сельсавета І.М. Анушак звярнууся ў Кобрынскі райвыканкам з просьбай вызваліць яго ад абавязковых дзяржпаставак, спасылаючыся на наяўнасць усяго аднаго працаздольнага члена сям'і. Аднак яму было адмоўлена: вызваленне ад дзяржпаставак магчыма толькі ў выключных выпадках (стыхійныя бедствы, поўная адсутнасць працаздольных членаў сям'і), і размова можа ісці толькі пра адтэрміноўку паставак [2].

Частка сялян стала на шлях затрымкі і нават адмовы ад выканання абавязковых паставак сельгаспрадукцыі, што стала прычынай вострага рэагавання партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва. Кобрынскі райкам КП(б)Б і райвыканкам у верасні 1940 г. накіравалі ўсім старшыням сельсаветаў прадпісанне ў сувязі з невыкананнем плана хлебапаставак усімі сельсаветамі раёна. Гэтае невыкананне было названа нецярпімым, і прадпісанне абавязвала старшынь сельсаветаў забяспечыць завяршэнне хлебапаставак на працягу 3-х дзён шляхам разгортвання масава-палітычнай работы сярод сялян [3]. Многія сяляне, каб зменшыць аб'ёмы дзяржпаставак, ажыццяўлялі забой сваёй жывёлы. Такая практыка была кваліфікавана як правакацыйная дзейнасць варожых элементаў, на якую паддалася адсталая частка сялян [4]. Таксама мела месца ўтойванне сялянамі фактычнай колькасці зямлі ў карыстанні. Так, селянін А.М. Назарчук замест фактычна належаўшых яму 60 га зямлі падаў звесткі аб 36 га, а селянін К.У. Нічыпарук утаіў ад дзяржаўнага ўліку 30 га [5].

Галоўным правадніком дзяржаўнай палітыкі ў вёсцы з'яўляліся сельскія саветы, складзеныя пераважна з батракоў і беднякоў, якія падтрымалі савецкую ўладу. Гэтая частка вясковых працаўнікоў па афіцыйнай тэрміналогіі адносілася да «свядомых» сялян у адрозненне ад «несвядомых», да якіх прылічалі тых, хто насцярожана паставіўся да палітыкі ўладаў і неспяшаўся праяўляць з ёю салідарнасць. Першай запаведдзю сель-

саветаў лічыўся поўны і своечасовы разлік з дзяржавай па хлебных і іншых натуральных пастаўках. Яны літаральна адказвалі за ўсё: лесанарыхтоўкі, будаўніцтва дарог і мастоў, гаспадарчых аб’ектаў, асушэнне балот. Пры гэтым рабочай сілы, прылад працы і эфектыўнага матэрыяльнага стымулявання працы бракавала. Да таго ж зацвярджаныя планы работ былі вельмі напружанымі. Па вышэйзгаданых прычынах гэтыя планы часта не выконваліся. Так, у 1940 г. ў раёне быў поўнасцю правалены план дарожных работ. З боку Брэсцкага аблвыканкама кіраўніцтву Кобрынскага райвыканкама было прапанавана прыняць самыя рашучыя меры па выкананні даведзенага плана дарожных работ у самыя сціслыя тэрміны [6]. Пад «рашучымі мерамі» разумеўся перш за ўсё непрыхаваны адміністрацыйны ціск і запалохванне. Акрамя таго, вялікая ўвага надавалася вядзенню масава-палітычнай працы ў вёсцы. Яе галоўнымі напрамкамі былі азнаямленне сялян з рашэннямі партыі і ўрада, мясцовых органаў улады, прапаганда пераваг і дасягненняў савецкага ладу, калектыўная чытанне газетных матэрялаў на злабадзённыя тэмы, клеймаванне класава варожых элементаў, да якіх адносілі кулакоў і ўсіх нязгодных з новай уладай, ухвала і падтрымка перадавых і «свядомых» сялян з ліку батрацка-бядняцкай часткі сялянства, якія патрымлвалі палітыку савецкай улады.

Пры вядзенні масава-палітычнай працы асаблівая увага надавалася нястомнаму клопату савецкай дзяржавы аб селяніне-працаўніку. Адначасова падкрэсліваўся яго абавязак быць удзячным за гэты клопат і быць адданым савецкай дзяржаве, напружана і эфектыўна працаваць на яе карысць. Яскравыя прыклады такога трэнда даюць заклікі савецкага кіраўніцтва да знамянальных падзей у палітычным жыцці: «Ударнай працай прадэманструем нашу адданасць партыі Леніна – Сталіна, нашу бязмежную любоў да вялікага правадыра народаў роднага Сталіна!»; «Ператворым падпіску на пазыку трэцяй пяцігодкі ў дэманстрацыю савецкага патрыятызму, любові і адданасці сацыялістычнай радзіме!»; «Сельскія працаўнікі, мабілізоўвайце сваю энергію і ініцыятыву на выкананне гаспадарча-палітычных кампаній, на выкананне рашэнняў партыі і ўрада!». Толькі вось было невядома, адкуль гаротнаму селяніну можна было чэрпаць энергію і як прымусіць сябе на паўгалодны страўнік упарта выконваць рашэнні партыі і ўрада, якія не адпавядалі яго эканамічным інтэрэсам і руйнавалі звыклы ўклад жыцця. Увогуле можна канстатаваць, што сельскія саветы замест адстойвання інтарэсаў сялян абслугоўвалі інтарэсы ўлады, якая дзеля дасягнення пакорлівасці сялянства і фарміравання свайго прывабнага іміджу ажыццяўляла жорсткі адміністрацыйны і ідэалагічны ціск, дэмагагічна сцвярджаючы, што ён адлюстроўвае клопат аб сельскім працаўніку. Трэба адзначыць: магутны вал масава-палітычнай работы аказваў уплыў на сялянства, асабліва на яго батрацка-бядняцкую частку. Думкі і настроі сялян, якія апынуліся пад уплывам бальшавіцкай прапаганды і агітацыі, выдаваліся за думкі і настроі ўсяго сялянства.

Састаўной часткай аграрнай палітыкі стала вынішчэнне слоя заможных сялян, т.зв. кулакоў. Першым крокам на гэтым шляху стала ліквідацыя хутароў з наступным высяленнем хутаран у вёскі (у Кобрынскім раёне ў 1940 г. мелася 3 370 хутароў [7]).

Другім крокам на шляху ліквідацыі заможнага сялянства стала абрэзка зямлі, якая ажыццяўлялася ў адносінах да сялянскіх гаспадарак, што мелі ў карыстанні больш за 15 га зямлі і выкарыстоўвалі раней ці зараз наёмную працоўную сілу. Непасрэдна абрэзку зямлі ажыццяўлялі сельскія саветы. Абрэзаная зямля залічвалася ў дзяржаўны зямельны фонд. Па нашых падліках, у выніку абрэзкі ў кожнай сялянскай гаспадарцы засталося ў карыстанні прыкладна па 5 га зямлі, у тым ліку прыкладна 2 га раллі, 1–1,5 га сенажаці і 1–1,5 га пашы.

Трэцім крокам па выкараненні эканамічна моцных гаспадарак сталі надзвычай вялікія падаткі і натуральныя пастаўкі дзяржаве. Яны мелі ўстойлівую тэндэнцыю да няўхільнага павышэння і перайшлі мяжу эканамічнай мэтазгоднасці, калі селянін ужо не меў ніякай магчымасці іх выканаць. У выніку матэрыяльныя стымулы да працы на зямлі страчваліся, а заможныя сяляне па сваім гаспадарчым стане і дабрабыце апускаліся да ўзроўня сялян-беднякоў.

Характарызуючы палітыку савецкай улады ў адносінах да заможнага сялянства, неабходна адзначыць адну важную акалічнасць: на Кобрыншчыне і ўвогуле ва ўсёй Заходняй Беларусі масавае раскулачванне не праводзілася, як гэта мела месца падчас калектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР у 1920–30-я гг. У гэтым не было патрэбы, бо праслойка заможных сялян была нязначнай (каля 5% ад агульнай колькасці сялян) па прычыне панавання польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання.

У выніку адзначаных мерапрыемстваў заможныя сяляне як асобны сацыяльны слой страцілі самастойнае эканамічнае, сацыяльнае і палітычнае значэнне. На наш погляд, усе захады ў галіне аграрных адносін супярэчылі эканамічным інтарэсам сялянства, не стваралі, а, наадварот, падрывалі магчымасці іх гаспадарчага ўмацавання і росту матэрыяльнага дабрабыту. Аднак паўстае пытанне: навошта і каму гэта было патрэбна? На першы погляд, у такой палітыцы не было рацыянальнага зместу: эканамічная моц сялянскіх гаспадарак змяншалася, падаткаабкладаемая база ў вёсцы скарачалася, незадавальненне сялян савецкай уладай расло. Разам з тым логіка палітычных захадаў савецкай улады існавала, і яна тлумачыцца імкненнем стварыць адпаведныя эканамічныя, сацыяльныя і псіхалагічныя ўмовы, каб падштурхнуць сялян да ўступлення ў калгасы, якія пачалі ствараццa ўжо восенню 1939 г. «Калгасны шлях, шлях сацыялізму ёсць адзіна правільны шлях для працоўных сялян», – сцвярджаў пункт 1 Прыкладнага Статута сельскагаспадарчай арцелі (зацверджаны СНК СССР і ЦК УКП (б) 17 лютага 1935 г.). Такім чынам, лёс сялянства (без яго ведама і яго жадання) быў прадвызначаны і ніякай альтэрнатывы ў развіцці вёскі не прадугледжвалася.

Асноўнай формай калектыўных гаспадарак у вёсцы стала сельскагаспадарчая арцель (далей – сельгасарцель, арцель), якая ствaралася на аснове абагульнення асноўных сродкаў вытворчасці селяніна: зямлі, інвентару і цяглавай сілы. На пачатку 1940 г. ў Кобрынскім раёне існавалі 4 сельгасарцелі: імя Сталіна, імя Варашылава, імя Молатава і «Запавет Ільіча». Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што арцелі былі названы ў гонар бальшавіцкіх лідараў і адлюстроўвалі бальшавіцкія палітычныя каштоўнасці.

Створаныя арцелі мелі малаколькасны склад, былі эканамічна слабымі. Яны разам аб’ядноўвалі 142 гаспадаркі: 41 батрацкая, 27 бядняцкіх, 74 серадняцкіх [8]. У іх меўся востры недахоп цяглавай сілы, грубых кармоў, насеннага фонду, сіласных і агародных культур, інвентару, прыстасаваных жывёлагадоўчых памяшканняў. Члены сельгасарцелі, альбо па-іншаму калгаснікі, не мелі вопыту кіравання калектыўнай гаспадаркай. Абцяжарвала становішча і тое, што «свежаспечаныя» калгаснікі, зусім нядаўнія сяляне, не былі ў сваёй большасці добрымі гаспадарамі на зямлі і не карысталіся павагай аднавяскоўцаў, якія лічылі іх гультаямі і нядбайнікамі. У калгасах імя Сталіна і імя Варашылава ўраджайнасць бульбы ў 1940 г. склала ўсяго 10 ц/га і не пакрыла нават выдаткаў на насенны фонд. Усе чатыры калгасы раёна не змаглі ўнесці ў банк грашовыя сродкі для папаўнення непадзельных фондаў, набыцця сельскагаспадарчай тэхнікі і рамонту інвентара [8, арк. 2]. Адначасова ўсе калгасы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па абавязковых пастаўках збожжа.

Для паляпшэння эканамічнай сітуацыі ў калгасах у якасці галоўных былі абраны адміністрацыйна-камандныя сродкі, непрыхаванае ўмяшанне ў калгасные справы з боку кіруючых партыйных і савецкіх органаў. Кобрынскі райкам КП(б)Б і райвыканкам бесперапынна дасылалі кіраўніцтву калгасаў патрабаванні прымаць «рашучыя меры» па засыпцы насенных фондаў, рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі і збруі, нарыхтоўцы і вывазе торфу, ажыццяўленні ў поўным аб'ёме збожжавых дзяржпаставак, будаўніцтве і рамонце жывёлагадоўчых памяшканняў, нарыхтоўцы ільновалакна, наладжванні племяннoй справы, узорванню папараў, лушчэнні сцярні, культывацыі ворыва, абмалоце азімых культур і г.д. Акрамя «рашучых мер», пад якімі разумеўся адміністрацыйны ціск, шырока выкарыстоўваўся і агітацыйна-прапагандысцкі ціск з мэтай навязаць калгаснікам і ўсяму сялянству ўяўленне, што калгасы – гэта адзіны шлях да заможнага і шчаслівага жыцця. Дзеля гэтага, у прыватнасці, шырока выкарыстоўваўся перыядычны друк, які ў квяцістай форме рэгулярна распавядаў, як хораша і радасна жывецца калгаснікам. Вось толькі адзін прыклад: селянін вёскі Піркі Пескаўскага сельсавета Кобрынскага раёна, член калгаса імя Сталіна Катанка Сямён Міхайлавіч распавядаў на старонках абласной газеты «Зара»: «Ліквідавана няшчасная трохполка, галодная цераспалосіца. Палі калгаса напоўніліся гулам трактароў, вясёлымі, радаснымі песнямі маладых калгаснікаў. Не параўнаеш наша сённяшняе жыццё з мінулым. Бывала, выедзем, не снедаўшы, араць. Рукі дрыжаць, плуг хістаецца, каняка ледзь ногі цягне. Зварочваешся дамоў ні жывы ні мёртвы. А прыйдзе восень – непасільныя падаткі, штрафы, здзекі солтыса і паліцыянтаў – так працякала наша гаротнае жыццё пры крывапіўцах-панах. А цяпер калектыўна арoм, калектыўна косім, калектыўна жнём і дружна жывём. Наша сённяшняе жыццё цвіце радасцю і чаруючым хараством, з кожным днём прыходзяць новыя перамогі. Мы самі гаспадары свайго жыцця… У калгасе добра наладжана працоўная дысцыпліна. Калгаснікі выходзяць на працу ў 8 гадзін раніцы і вяртаюца з палёў у 10–11 гадзін вечара» [9].

Перыядычны друк таксама заклікаў «узняць ярасць мас супраць дэзарганізатараў калгаснай вытворчасці», «распаліць працоўны энтузіязм калгаснага сялянства», «разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар першай гадавіны ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР», «несцістраснае бальшавіцкае слова ў масы», «аддзячыць за сучаснае радаснае і шчаслівае жыццё Камуністычнай партыі, Савецкаму ўраду і асабіста таварышу Сталіну, які ўказаў сялянству шлях да шчаслівага жыцця». Пры гэтым друк не паведамляў, у чым заключалася шчасце калгаснікаў, якія выходзілі на працу ў 8 гадзін раніцы і вярталіся з палёў у 11 гадзін вечара, і якія за сваю працу нічога ці амаль нічога не атрымлівалі. Напрыклад, у Кобрынскім раёне ў 1940 г. было выдадзена авансам на працадні у двух калгасах – па 2 кг збожжа, у адным – па 0,5 кг збожжа, а грубых кармоў для жывёлы – ад 0,5 кг сена да 2 кг. Гэтым і абмежаваліся [8, арк. 2].

Таму галоўнай крыніцай самазабеспячэння калгаснікаў заставалася асабістая падсобная гаспадарка, на якой яны карпелі пасля працы ў калгасах. У пачатку 1941 г. ў Кобрынскім раёне быў створаны яшчэ калгас імя Калініна. Усе пяць калгасаў агулам аб'ядноўвалі каля двух сотняў сялянскіх гаспадарак (прыкладна 3% агульнай колькасці). Такім чынам, у даваенны перыяд індывідуальная сялянская гаспадарка ў раёне амаль цалкам захавалася, але сялянскае жыццё з прыходам савецкай улады не палепшылася. Што ж да значнай часткі сялян-аднаасобнікаў і асабліва заможных сялян, то іх эканамічны стан і ўзровень дабрабыту істотна знізіліся і наблізіліся да ўзроўня батрацка-бядняцкай часткі вёскі і сялян-калгаснікаў. Вось такія сумныя вынікі нястомнага «клопату» сацылістычнай маці-радзімы аб сельскім працаўніку.

**Заключэнне**

1. Палітыка савецкіх уладаў у вёсцы была з самага пачатку накіравана на пазбаўленне ад польскай аграрнай спадчыны шляхам вынішчэння памешчыцкага і асадніцкага землеўладання.

2. Галоўная ўвага ў вёсцы надавалася аграрным пераўтварэнням, якія абмяжоўвалі эканамічную свабоду і гаспадарчую самастойнасць селяніна, накіроўвалі развіццё сельскай гаспадаркі па сацыялістычным, калгасным шляху, падобным да тых аграрных пераўтварэнняў, якія праводзіліся ў БССР напрыканцы 1920-х – 1930-я гг.

3. Аграрным пераўтварэнням на сацыялістычнай аснове была падпарадкавана ідэалагічная і масава-палітычная работа партыйных і савецкіх органаў. Стрыжань гэтай работы: бальшавіцка-савецкая палітыка ў вёсцы адпавядае карэнным інтарэсам працоўнага сялянства, а калгасны лад – адзіна правільны шлях да заможнага жыцця.

4. Аграрныя змены не апраўдалі надзей сялянства на лепшае жыццё з прыходам савецкай улады, выклікалі іх расчараванне, аднак не прывялі да масавага сацыяльнага пратэсту, бо сяляне даўно звыкліся са сваім занядбаным становішчам.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 72. – Арк. 40. Дакладная запіска аб стане сялянскай гаспадаркі Кобрынскага раёна ад 12 студзеня 1940 года.
2. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 59. – Арк. 110. Адказ Кобрынскага райвыканкама гр. І.М. Анушаку вёскі Каленіца Тэвельскага сельсавета аб вызваленні ад абавязковых паставак.
3. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп.1. – Спр. 57. – Арк. 2. Прадпісанне старшыні Кобрынскага райвыканкама Таранава і сакратара райкама КП(б)Б Аронава ад 9 верасня 1940 года аб невыкананні плана хлебапаставак усімі сельсаветамі раёна.
4. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп.1. – Спр. 57. – Арк. 66. Пісьмо сакратара Брэсцкага абкама КП(б)Б Кісялёва і старшыні Брэсцкага аблвыканкама Длугашэўскага кіраўніцтву Кобрынскага райвыканкама ад 25 верасня 1940 года.
5. Зара. – 1940. – 5 ліп.
6. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 57. – Арк. 126. Аб выкананні плана работ па дарожнаму будаўніцтву ў Кобрынскім раёне. Пастанова Брэсцкага аблвыканкама ад 6 мая 1941 года.
7. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 3. Эканамічная характарыстыка тэрыторыі Кобрынскага, Жабінкаўскага, Антопальскага і Дзівінскага раёнаў.
8. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 72. – Арк. 1. Дакладная запіска аб стане калгасаў Кобрынскага раёна і падрыхтоўцы да веснавой пасяўной кампаніі 1941 г.
9. Зара. – 1940. – 21 жніўня.

***Ermakovich L.I., Romanovich P.S.*** **The Village of Kobrin Region during the Pre-War Period (1939–1941)**

The article considers and analyzesthe actions of the Soviet power in the field of agriculture in Kobrin region after the reunion of Western Belarus with the BSSR from the autumn of 1939 to June, 1941. Thus the major attention is paid to consideration of the main directions of agrarian transformations: destruction of the agrarian heritage of the Polish state, elimination of a prosperous part of the peasantry, restriction of economic freedom of peasants and deprivation of their economic independence with the beginning of collective-farm construction. In the context of agrarian transformations the content of mass and political work among the peasantry for the purpose of change of their psychology and formation of the loyal relation to the Soviet power is also considered.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 20.10.2014